# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 15 сакавіка 2001 года, чацвер, № 4 (1833)




АФІЦЫЙНА

## БДУ ВЫЗНАЧАЕ АРЫЕНЦІРЫ

20 лютага прайшло першае пасяджэнне Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ, створанага ў адпаведнасці з прэзідэнцкім указам. На пасяджэнні было абрана кіраўніцтва Савета: старшынёй стаў рэктар БДУ прафесар Аляксандр Казулін, намеснікам — рэктар БДПА Барыс Хрусталёў.

Апрача таго, абмяркоўваліся перспектывы рэфармавання вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Ужо з наступнага года БДУ плануе перайсці на новую шматузроўневую сістэму падрыхтоўкі студэнтаў. Пакуль што гэтая рэформа будзе распаўсюджвацца толькі на наш універсітэт — у форме эксперыменту. Астатнія ВНУ вызначацца са сваім стаўленнем да яе пазней.

Палажэнне аб Рэспубліканскім савеце рэктараў вышэйшых навучальных устаноў чытайце на 2-й старонцы.

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*





НЕ ПРАМІНІЦЕ!

## *Каменная казка*

З 22 па 25 сакавіка на геаграфічным факультэце БДУ будзе праводзіцца выстава-кірмаш "Каменная казка", прымеркаваная да Дня геолага, які адзначаецца ў першую нядзелю красавіка.

Выстава гэтая даволі цікавая і прадстаўнічая. Тут можна ўбачыць сапраўдную каменную вясёлку, а часам і здзівіцца — няўжо камень напраўду можа быць такой дзіўнай формы? На выставе можна не толькі паглядзець на камяні, але і набыць разнастайныя ўпрыгожанні з натуральнага каменя, падабраць якія-небудзь ювелірныя вырабы паводле свайго густу і знака Задыяка.

З кожным годам удзельнікамі выставы становіцца ўсё больш і больш мастакоў і ювеліраў з Беларусі, Расіі, Украіны (у мінулай выставе прымалі ўдзел больш за 60 прадстаўнікоў ювелірнага мастацтва). Многія з іх ужо сталі пастаяннымі ўдзельнікамі выставы.

Акрамя таго, вельмі шырока будуць прадстаўлены на выставе ўпрыгожанні з розных араматных парод дрэва, алеі з высокаканцэнтраванымі водарамі траў ці кветак (ружовы, лавандавы алей).

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## *Пра студэнтаў – ад студэнтаў*

Радыёстанцыя "Unistar — радыё БДУ" стварае новую студэнцкую праграму з умоўнай назвай "Эх, жизнь студенческая!" Плануецца зрабіць яе штотыднёвай. Да ўдзелу запрашаюцца студэнты, якія маюць арыгінальны склад мыслення, пачуццё гумару і жадаюць распавесці пра свой факультэт, сваё навучанне, свой вольны час і г. д. Слухайце і распавядайце ў радыёэфіры смешныя і цікавыя гісторыі са студэнцкага жыцця! Звяртайцеся, калі ласка, па тэлефоне 209-53-76.

*Зацверджана*
*Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 08.02.2001 № 71*

# ПАЛАЖЭННЕ АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ САВЕЦЕ РЭКТАРАЎ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

1. Рэспубліканскі савет рэктараў вышэйшых навучальных устаноў (далей — Савет) створаны для выпрацоўкі рэкамендацый па пытаннях вышэйшай адукацыі, удасканалення навучальна-выхаваўчага працэсу, развіцця навукі і паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшай школы.

2. Савет у сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі законамі Рэспублікі Беларусь, прававымі актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у тым ліку гэтым Палажэннем, іншымі актамі заканадаўства.

3. Асноўнымі задачамі Савета з'яўляюцца:

3.1. падрыхтоўка прапаноў па:

3.1.1. забеспячэнню эфектыўнага кіравання вышэйшай адукацыяй і навуковай дзейнасцю, якое ажыццяўляецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, удасканаленню дзяржаўнай палітыкі і яе рэалізацыі ў сферы вышэйшай адукацыі і навукі;

3.1.2. павышэнню эфектыўнасці выкарыстання матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў у сферы вышэйшай адукацыі і навукі;

3.1.3. павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў;

3.2. правядзенне аналізу і экспертызы праектаў нарматыўных прававых актаў, у тым ліку адукацыйных стандартаў, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць дзейнасць вышэйшай школы і навукі;

3.3. распрацоўка і прадстаўленне рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання прапаноў па сацыяльнай абароне работнікаў сістэмы вышэйшай адукацыі;

3.4. унясенне ва ўстаноўленым парадку ў адпаведныя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання прапаноў аб узнагароджанні кіраўнікоў сістэмы вышэйшай адукацыі рэспублікі дзяржаўнымі ўзнагародамі;

3.5. удзел у разглядзе кандыдатур на пасады кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, фарміраванні рэзерву на замяшчэнне пасад кіраўнікоў ВНУ;

3.6. умацаванне сувязяў ВНУ з навуковымі арганізацыямі, аб'яднаннямі прадпрымальнікаў па пытаннях падрыхтоўкі студэнтаў, забеспячэння занятасці выпускнікоў, укаранення навуковых дасягненняў у вытворчасць;

3.7. удзел у абмеркаванні размеркавання стыпендый, грантаў, надбавак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі;

3.8. ажыццяўленне мэтанакіраванай дзейнасці па развіццю ўсебаковых сувязяў вышэйшай школы рэспублікі з замежнымі партнёрамі.

4. Для ажыццяўлення пастаўленых задач Савету прадастаўляецца права:

4.1. уносіць у рамках сваёй кампетэнцыі ва ўстаноўленым парадку прапановы на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

4.2. заслухоўваць на сваіх пасяджэннях рэктараў вышэйшых навучальных устаноў, паведамленні прадстаўнікоў міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі Савета;

4.3. па матываванаму запыту атрымліваць ад міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў звесткі і даныя, якія маюць адносіны да пытанняў вышэйшай адукацыі і навукі;

4.4. ініцыіраваць і ўзгадняць ліцэнзаванне, рэарганізацыю і ліквідацыю ўстаноў вышэйшай адукацыі, пытанні іх назвы, змянення статусу, адкрыцця новых спецыяльнасцяў, у тым ліку ў адносінах да вышэйшых навучальных устаноў недзяржаўнай формы ўласнасці;

4.5. удзельнічаць у фарміраванні дзяржаўных, галіновых і міжвузаўскіх навукова-даследчых праграм;

4.6. уносіць прапановы па пераліку вакансій, якія аб'яўляюцца пры выбарах у Нацыянальную акадэмію навук Беларусі і ўдзельнічаць ва ўзгадненні гэтага пераліку;

4.7. ствараць часовыя экспертныя і рабочыя групы, творчыя калектывы з прыцягненнем спецыялістаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый і вучоных рэспублікі (з іх згоды) для правядзення экспертызы і падрыхтоўкі прапаноў па напрамках дзейнасці Савета;

4.8. праводзіць сумесна з міністэрствамі, іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі выязныя пасяджэнні Савета, прысвечаныя разгляду пытанняў развіцця вышэйшай адукацыі і навукі ў рэгіёнах рэспублікі;

4.9. праводзіць работу па прапагандзе дасягненняў вышэйшай школы рэспублікі за мяжой;

4.10. праводзіць семінары, сімпозіумы, канферэнцыі па праблемах развіцця вышэйшай школы.

5. Савет фарміруецца з рэктараў вышэйшых навучальных устаноў, арганізацый паслядыпломнай адукацыі на агульным сходзе кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў і арганізацый паслядыпломнай адукацыі.

Работай Савета кіруе старшыня, які выбіраецца з ліку рэктараў ВНУ, а ў яго адсутнасць — намеснік. Старшыня Савета і яго намеснік выбіраюцца на пасяджэнні савета тэрмінам на пяць гадоў тайным галасаваннем. Кандыдатура лічыцца выбранай, калі за яе прагаласавала больш як палова членаў савета, якія прысутнічаюць на пасяджэнні.

Для аператыўнага кіравання работай Савета ствараюцца прэзідыум Савета і камісіі па асноўных напрамках дзейнасці Савета. Састаў прэзідыума і камісій, функцыі і парадак іх дзейнасці вызначаюцца Саветам.

Для больш поўнага і ўсебаковага абмеркавання праблем функцыянавання і развіцця вышэйшай школы на пасяджэнні Савета могуць запрашацца (з іх згоды) кіруючыя работнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый.

Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з планам работы, які зацвярджаецца на пасяджэнні Савета.

Савет праводзіць свае пасяджэнні па меры неабходнасці, але не радзей чым два разы ў год. Савет правамоцны прымаць рашэнні пры ўмове прысутнасці на пасяджэнні не менш за дзве трэці яго саставу. Рашэнні Савета прымаюцца простай большасцю галасоў прысутных. У выпадку роўнасці галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы. Рашэнні Савета афармляюцца пратаколам, які даводзіцца да зацікаўленых.

Арганізацыя дзейнасці савета ў частцы, не прадугледжанай гэтым Палажэннем, вызначаецца рэгламентам, які зацвярджаецца Саветам.

Прадстаўнікі Савета па прадстаўленню прэзідыума Савета могуць уваходзіць у састаў калегій Міністэрства адукацыі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама прэзідыумаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Савета перыядычна інфармуе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб стане спраў у вышэйшай школе і навуковай сферы рэспублікі.

6. Арганізацыйнае, інфармацыйнае і матэрыяльнае забеспячэнне дзейнасці Савета, уключаючы вядзенне справаводства, ажыццяўляецца ВНУ, рэктар якой выбраны старшынёй Савета.

# Першыя будынкі БДУ

Арганізацыйная праца па стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта стала вялася з канца 1918 года, і ўжо 25 лютага 1919 года Цэнтральны выканаўчы камітэт ССРБ намеціў канкрэтныя меры па адкрыцці ў Мінску універсітэта са статусам дзяржаўнага. Для гэтага былі выдзелены грошы (хоць і невялікія), пры губернскім камісарыяце народнай асветы стварылі камісію з сямі чалавек пад кіраўніцтвам Я.Ф. Карскага. Урад Савецкай Беларусі звяртаўся да Масквы не столькі па дазвол, колькі па матэрыяльную дапамогу. Ён абгрунтоўваў свае планы стварэння першага універсітэта першай асобнай беларускай дзяржавы "соображениями экономического, технического и культурно-бытового характера местной жизни".

Адна з галоўных задач, якая павінна была быць вырашана станоўча і найперш за ўсе астатнія, — знайсці ў разбураным рэвалюцыйнымі падзеямі, польскай акупацыяй Мінску больш-менш прымальныя для вядзення вучэбных заняткаў будынкі і памяшканні. Іх трэба было адшукаць, прыстасаваць да універсітэцкіх патрэбаў. З пункту гледжання юрыдычных акалічнасцяў, перашкод для савецкіх улад не было — усе дзеянні абгрунтоўваліся задачамі будаўніцтва новага грамадства і выхоўвання для яго людзей новага гарту. Таму патрэбныя будынкі проста перадаваліся універсітэту.

Так, ужо 10 сакавіка 1919 года на пасяджэнні камісіі па арганізацыі БДУ было разгледжана пытанне аб пераходзе да універсітэта будынка былога камерцыйнага вучылішча, у якім размяшчаліся ваенныя курсы Заходняй дывізіі. У хуткім часе пад запланаваны універсітэт адвялі памяшканне былой мужчынскай гімназіі на рагу вуліцаў Губернатарскай і Падгорнай (цяперашніх — Леніна і Маркса), будынкі духоўнай семінарыі на Аляксандраўскай вуліцы (цяперашняя вуліца Максіма Багдановіча), былога жаночага духоўнага вучылішча на рагу вуліцаў Шырокай і Міхайлаўскай (цяперашніх — Куйбышава і Камуністычнай), былога вайсковага шпіталя, губернскай земскай бальніцы, рэальнага вучылішча Хайкіна, гімназіі Фальковіча і інш.

Але толькі ў 1921 годзе спецыяльнай пастановай Прэзідыума ЦВК Беларусі (ад 18 красавіка) быў афіцыйна зацверджаны спіс будынкаў, якія пераходзілі "для нужд" БДУ. Адзначым, што адначасова універсітэт атрымаў у сваё распараджэнне прылеглыя землі, інвентар і г. д. Усе арганізацыі, якія да гэтага часу там размяшчаліся, павінны былі да 1 ліпеня з'ехаць і перадаць універсітэту свае плошчы. Акрамя раней пералічаных будынкаў, у спісе былі названыя памяшканні фабрыкі "Вікторыя", яўрэйскай бальніцы, Рускага сходу, гаспадарка "Лошыца" з фальваркамі "Зацішша", "Дуброва", "Прылукі", лясная дача Ваньковіча.

Асобнае месца ў гэтым дастаткова доўгім пераліку займаюць будынкі гімназіі Фальковіча і вучылішча Хайкіна. Менавіта тут размясцілася першае праўленне БДУ, тут распачаліся першыя лекцыі, адчыніліся дзверы універсітэцкай бібліятэкі.

У гісторыю універсітэта будынак былой гімназіі Фальковіча ўвайшоў як "Першы дом БДУ", бо ў ім працаваў рэктар, дзейнічала бібліятэка і канцылярыя, вяліся заняткі на рабочым факультэце. Гэты будынак стаяў на рагу вуліцаў Магазіннай і Кашарнай яшчэ з 1863 года: яго пабудаваў для сваёй сям'і купец Сакер. З гадамі мяняліся ўладальнікі гэтага неардынарнага па сваёй архітэктуры невысокага дома. Мяняліся і назвы вуліцаў, на якіх ён стаяў: Кашарная стала называцца Батальённай, потым — Скобелеўскай, пры савецкай уладзе — Чырвонаармейскай. Магазінная вуліца (і гэта знамянальна) з 1922 года атрымала назву Універсітэцкай, бо на ёй сталі галоўныя будынкі БДУ: і "Дом № 1" — гімназія Фальковіча, і "Дом № 2" — фабрыка "Вікторыя", і "Дом № 3" — вучылішча Хайкіна.



*Гімназія Фальковіча.*

У 1906—1920 гадах былы дом купца Сакера прытуліў у сваіх сценах прыватную гімназію з правамі ўрадавай, арганізатарамі і фактычнымі гаспадарамі якой былі К.В. Фальковіч і С.П. Зубакін. Цікава, што Фальковіч пасля канфіскацыі ягонай маёмасці пэўны час не пакідаў сцен сваёй, цяпер ужо былой, гімназіі. Ён быў прыняты на працу ва універсітэт на стаўку выкладчыка рабфака, выкладаў хімію і нават праславіўся як здатны на ўсе рукі чалавек, бо сам рабіў мэблю і абсталяванне для лабараторыі аналітычнай хіміі. Мабыць, за гэта праўленне універсітэта ўжо ў 1924 годзе вынесла рашэнне выдаць "гражданину Фальковичу", былому гаспадару "Дома № 1 БДУ", частку яго маёмасці — рэчы хатняга ўжытку, якія для БДУ так і не спатрэбіліся. Такім чынам, руплівасць былога гаспадара, былога калежскага саветніка на ніве універсітэцкай адукацыі была хоць неяк адзначана.

Будынак рэальнага вучылішча, які да рэвалюцыі належаў (як і само прыватнае вучылішча) Э.М. Хайкіну, адметны тым, што ў яго аўдыторыях распачаліся першыя заняткі: якраз тут 30 кастрычніка прафесар-гісторык Д.П. Канчалоўскі прачытаў першую лекцыю студэнтам факультэта грамадскіх навук (падкрэслю: студэнтам, а не слухачам рабочага факультэта), лекцыю пра культуру і гісторыю міжземнаморскіх народаў і краінаў часоў сярэднявечча. Гэты будынак па вуліцы Магазіннай (чытай — Універсітэцкай, цяпер Кірава; зараз на яго месцы знаходзіцца будынак СНД) стаў месцам, дзе нарадзіўся наш універсітэт: 30 кастрычніка 1921 года з'яўляецца днём нараджэння Белдзяржуніверсітэта.

Такім чынам быў пакладзены пачатак універсітэцкай адукацыі на Беларусі. Эмануіл Маісеевіч Хайкін, гаспадар аднаго з першых будынкаў БДУ, і гаспадар згаданай вышэй гімназіі Канстанцін Восіпавіч Фальковіч воляй лёсу і, зразумела, рэвалюцыйна-аднаўленчых працэсаў назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю нашай alma mater. Наперадзе будуць не менш цяжкія гады, будзе імкненне да зменаў і ў матэрыяльным становішчы, і ў творчых здабытках, але першапачатковае становішча, першыя крокі да сваёй, універсітэцкага кшталту, сталасці, якасці заўсёды будуць выклікаць цеплыню і павагу ў нас, у нашчадкаў, у цяперашняй і будучай садружнасці, імя якой — БДУ!

*А.А. ЯНОЎСКІ,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце*

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ



Як паведаміў нашай газеце дырэктар Выдавецкага цэнтра БДУ Аляксандр Уладзіміравіч Вялько, за мінулы год ва універсітэце выйшлі ў свет 253 выданні агульным аб'ёмам 1504 уліковавыдавецкія аркушы. З іх 71 кніга фінансавалася з дзяржбюджэту, 182 — са спецсродкаў. Гэта 186 вучэбных, 54 навуковых і 13 даведачных выданняў. На беларускай мове выдадзена 39 кніг, на рускай — 186, на замежных мовах — 28. У друкарні Выдавецкага цэнтра БДУ выдадзена 179 кніг. З грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь выйшла 21 кніга. На ксераксах факультэтаў размножаны 74 выданні (невялікія па аб'ёме і тыражом да ста экземпляраў).

Паколькі ў БДУ ўводзіцца шматузроўневая адукацыя, у бягучым годзе плануецца выпусціць вучэбна-метадычныя комплексы (ВМК) для самастойнай работы студэнтаў па большасці навучальных дысцыплін. Таксама плануецца выдаць курсы лекцый: кожны факультэт стварае аўтарскія калектывы для вырашэння гэтай надзённай задачы. Першымі сёлета пабачаць свет курсы лекцый, зацверджаныя Рэдакцыйна-выдавецкім саветам БДУ, аўтараў А.М. Курбацкага "Проектирование информационно-технологических систем", А.К. Кіклевіча, А.А. Кожынавай, І.У. Кур'ян "Курс польскай мовы", Г.С. Смалякова, С.І. Сідора "Тэорыя сацыяльна-эканамічнай геаграфіі". Будзе таксама папаўняцца серыя "Падручнікі БДУ".

20 лютага ў галоўным корпусе БДУ пачаў працаваць новы кніжны кіёск "Універсітэцкая кніга". Па словах загадчыцы сектара рэалізацыі Выдавецкага цэнтра Лідзіі Мікітаўны Дубавец, у кіёску можна набыць кнігі, якія выдаюцца ў Выдавецкім цэнтры БДУ. На жаль, асартымент пакуль што небагаты, і на сённяшні дзень кіёск больш нагадвае кніжную выставу. У бліжэйшы час будуць прынятыя неабходныя нарматыўныя дакументы, і факультэты змогуць прадаваць свае выданні. Мы спадзяемся, што хутка тут можна будзе не толькі пабачыць кнігі, якія выйшлі ў нашым універсітэце, але і набыць іх.

У гэтым артыкуле мы прадстаўляем нашым чытачам толькі некаторыя кнігі, выдадзеныя ў БДУ ў мінулым годзе. Усе яны ёсць у фондах Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, дзе з імі можна пазнаёміцца больш блізка.

*Л.А. Альсевич, С.А. Мазаник, Л.П. Черенкова. Практикум по дифференциальным уравнениям.* У дапаможніку з грыфам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь даюцца сціслыя тэарэтычныя звесткі і рашэнні тыпавых задач, у тым ліку вялікая колькасць задач прыкладнога характару з неабходнымі звесткамі з адпаведных галін фізікі, механікі, біялогіі, эканомікі. Прыводзяцца таксама заданні для кантрольных і лабараторных работ.

*В.М. Анищик, В.А. Горушко, В.А. Пилипенко, В.Н. Пономарь, В.В. Понарядов, И.В. Пилипенко. Физические основы быстрой термообработки. Создание многоуровневой металлизации.* У кнізе дэтальна разглядаецца прымяненне хуткай тэрмаапрацоўкі ў тэхналогіі СБІС.

*В.М. Анищик, В.А. Горушко, В.А. Пилипенко, В.Н. Пономарь, В.В. Понарядов, И.В. Пилипенко. Физические основы быстрой термообработки. Температурные поля и конструктивные особенности оборудования.* У манаграфіі дэтальна разглядаюцца фізічныя працэсы, якія выклікаюць награванне крэмніевых пласцін у выніку іх апраменьвання імпульсамі кагерэнтнага і некагерэнтнага святла. Выкладаюцца пытанні прымянення такіх апрацовак у тэхналогіі стварэння паўправадніковых прылад і інтэгральных мікрасхем, а таксама даюцца характарыстыкі асноўных відаў абсталявання, якое прымяняецца для гэтых мэт.

*А.В. Барковская. Антропосоциальная парадигма философии природы.* У манаграфіі разглядаецца гісторыка-культурная панарама навуковых і пазанавуковых канцэпцый прыроды ў іх зместавай эвалюцыі.

*Л.Д. Башкиров. Переводная литература Древней Руси.* Дапаможнік з грыфам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь прысвячаецца вывучэнню перакладной літаратуры Старажытнай Русі, яе крыніц, саставу, тэкстаў.

*Геаграфія глебаў з асновамі глебазнаўства.* Пад рэдакцыяй В.С. Аношкі. Падручнік выдадзены з грыфам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з праграмай курса "Геаграфія глебаў з асновамі глебазнаўства". У кнізе даецца агульная схема глебаўтварэння, уласцівасці, склад, генезіс, працэсы і класіфікацыя глебаў, разглядаецца геаграфія глебаў. Асаблівая ўвага надаецца стану і асаблівасцям выкарыстання глебаў у Беларусі.

*І.А. Еўтухоў. Познаантычныя канцэпцыі чалавека.* У гэтай кнізе праводзіцца рэканструкцыя і аналіз канцэпцый чалавека перыяду позняй антычнасці на захадзе Рымскай імперыі, прапануецца арыгінальнае вырашэнне адной з базавых праблем сучаснай гістарычнай навукі — механізму фарміравання менталітэту.

*А.И. Жук, К.В. Лавринович. Гуманизация и гуманитаризация математического образования в школе. Часть 1. Теория и методика.* У кнізе даецца канцэпцыя гуманізацыі навучання дысцыплінам фізікаматэматычнага цыкла, вызначаюцца яго прынцыпы і змест.

*А.И. Жук, К.В. Лавринович. Гуманизация и гуманитаризация математического образования в школе. Часть 2. Сборник задач.* У выданні падаецца практычны вопыт гуманітарызацыі школьнай матэматычнай адукацыі: распрацоўкі гуманітарных урокаў, віктарын, практыкумаў па матэматыцы для V-XI класаў агульнаадукацыйнай сярэдняй школы.

*А.И. Жук, К.В. Лавринович. Гуманизация и гуманитаризация математического образования в школе. Часть 3. История математики.* Гэта экскурс у гісторыю матэматыкі і фізікі праз прызму жыцця і дзейнасці выдатных матэматыкаў і фізікаў мінуўшчыны. Матэрыялы падаюцца ў выглядзе гутарак пра навукоўцаў, прыводзяцца цікавыя старонкі іх жыцця, даецца сціслы агляд развіцця матэматыкі ў Беларусі.

*Е.Д. Карих. Оптоэлектроника.* Кніга выдадзена з грыфам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь. У дапаможніку разглядаюцца фізічныя з'явы, якія ляжаць у аснове метадаў генерацыі і прыёму аптычнага выпраменьвання, прынцыпы фотаэлектроннага пераўтварэння, асновы метадаў аптычнай апрацоўкі інфармацыі, яе захаванне і адлюстраванне.

*В.П. Козлов, П.А. Мандрик. Системы интегральных и дифференциальных уравнений с L-параметром в задачах математической физики и методы идентификации тепловых характеристик.* У кнізе выкладзена агульная тэорыя інтэгральных і дыферэнцыяльных ураўненняў з пазіцыі прымянення яе да краявых задач матэматычнай фізікі.

*Н.Н. Кошель, И.Н. Шурим. Внутришкольный контроль по химии.* Кніга выдадзена ў серыі "Бібліятэка настаўніка". Дапаможнік змяшчае тэарэтычны і прыкладны матэрыял па арганізацыі і ажыццяўленні кантролю за станам школьнай хімічнай адукацыі.

*П.С. Лопух. Закономерности развития природы водоёмов замедленного водообмена, их использование и охрана.* У кнізе разглядаюцца пытанні фарміравання прыроды малых вадаёмаў запаволенага водаабмену (азёр, вадасховішчаў, кар'ерных вадёмаў, сажалак) Беларусі.

*С. Д. Малюковіч. Міфалогія: Старажытная Элада. Частка І.* Дапаможнік знаёміць з міфалогіяй Старажытнай Грэцыі. Аўтар разглядае міф у яго эвалюцыі, у сувязі з рытуальным абрадам, закранае пытанні філасофіі міфа.

*А.А. Махнач. Стадиальный анализ литогенеза.* Дапаможнік з грыфам Мінадукацыі

Рэспубліці Беларусь знаёміць з сутнасцю працэсаў, якія адбываюцца ў літагенезе, г. зн. на падземным этапе гісторыі асадкавага матэрыялу. Разглядаюцца прадмет, задачы, гісторыя развіцця і метады стадыяльнага аналізу літагенезу. У кнізе таксама даецца ўяўленне аб размяшчэнні зон літагенезу ў зямной кары.

***А.У. Машчэнскі, У.А. Машчэнскі. Курс матэматычнай логікі.*** Кніга выдадзена з грыфам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь і з'яўляецца навучальным дапаможнікам па курсе матэматычнай логікі.

***Н.Г. Севостьянова. Феномен религиозной морали в восточнославянской культурной традиции.*** На матэрыяле гісторыі расійскай дзяржавы і царквы, філасофіі, багаслоўя і літаратуры раскрываюцца вытокі, генезіс і сутнасць праваслаўна-хрысціянскай маралі.

***В.Г. Скатецкий. Лекции по математике для студентов химических специальностей.*** Кніга выдадзена ў серыі "Падручнікі БДУ" і з'яўляецца канспектам 72 лекцый, у якіх выкладаецца агульны курс матэматыкі ў адпаведнасці з праграмай для хімічных спецыяльнасцей універсітэтаў.

***Б.В. Стральцоў. Асноўныя творчыя метады ў журналістыцы.*** Аўтар даследуе праблемы творчых метадаў у сучаснай журналістыцы. Асаблівую цікавасць выклікаюць характарыстыкі эсэісцкага метаду і метаду г. зв. дзелавой аналітыкі. У кнізе прапануецца цалкам новая тэарэтычная канцэпцыя, якой даецца ўсебаковае абгрунтаванне.

***В.Г. Шадурский. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945—1990-е годы).*** У манаграфіі даследуюцца культурныя сувязі Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы ў другой палове XX стагоддзя. У даследаванні прыводзіцца вялікая колькасць фактычнага матэрыялу, частка з якога ўпершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

***И.И. Шпаковский. Агиография Древней Руси XI—XIV вв.*** У дапаможніку разглядаецца станаўленне, развіццё і асаблівасці жыційнага жанру ў літаратуры Старажытнай Русі, мастацкія асаблівасці і гісторыка-літаратурнае значэнне найбуйнейшых помнікаў ранняй усходнеславянскай агіяграфіі.

*Л. МІЦЕЎ*



# Жыццё для кнігі

Такую назву носіць выстава, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння вядомага рускага выдаўца і асветніка І.Дз. Сыціна. Адкрылася яна ў аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Іван Дзмітрыевіч Сыцін нарадзіўся 5 лютага 1851 года ў Кастрамской губерні. Яго бацька, сельскі пісар, добра разумеў патрэбу народа ў друкаваным слове. Таму дэвізам яго жыцця стала несці народу святло ведаў.

Іван Сыцін далучыўся да кніжнай справы ў 15 гадоў, калі паступіў на службу да купца П. Шарапава ў кніжна-карцінную лаўку на Нікольскім рынку ў Маскве. Лёс І. Сыціна паказвае нялёгкі шлях "наверх" выхадца з нізоў. Спярша ён выконваў дробныя даручэнні гаспадара, потым — суправаджаў абозы з лубачнымі карцінкамі і кніжкамі з Масквы на Украіну. Пасля гэтага ён стаў "важатым" кніга624ноша-афеняў, якія гандлявалі кніжным таварам, пераходзячы з аднае вёскі ў другую.

У 1876 годзе І.Дз. Сыцін арганізаваў літаграфскую майстэрню, якая пазней дала жыццё велізарнай літаграфскай справе. У хуткім часе кніжны тавар Сыціна стаў па-за канкурэнцыяй на Нікольскім рынку. Гэта дазволіла выдаўцу стварыць выдавецкае таварыства "И.Д. Сытин и К°". Выданні таварыства адзначаліся высокім узроўнем паліграфічнага выканання, выходзілі вялікімі тыражамі, былі досыць таннымі.

Вялікая заслуга І.Дз. Сыціна была ў тым, што ён выпускаў масавымі тыражамі танныя выданні класікаў рускай літаратуры — А.С. Пушкіна, М.В. Гогаля, Л.М. Талстога, пазнаёміў чытачоў з найлепшымі творамі замежных пісьменнікаў. Мільёны буквароў, падручнікаў, бібліятэчак для самаадукацыі, маляўнічых дапаможнікаў, папулярных календароў далучалі людзей да ведаў і культуры. Да таго ж, з 1895 года выдавецкае таварыства Сыціна, паводле парады А.П. Чэхава, стала выпускаць штодзённую газету "Русское слово". Аніводзін з расійскіх выдаўцоў не мог скласці канкурэнцыю І.Дз. Сыціну па размаху дзейнасці.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ён перадаў савецкай уладзе выдавецтва і друкарню і да 75-гадовага ўзросту працягваў працаваць у кнігавыдавецкай галіне.

Кнігі, альбомы, календары сыцінскага выдавецтва захоўваюцца ў многіх публічных бібліятэках. Іх апантана збіраюць кнігалюбы для ўласных калекцыяў. Ёсць яны і ў бібліятэцы нашага універсітэта, у чым вельмі лёгка пераканацца, наведаўшы выставу. Сярод найбольш цікавых экспанатаў хацелася б назваць такія кнігі, як "Великая реформа (19 февраля 1861 — 19 февраля 1911). Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем. Юбилейное издание. Т. 1—6. М., 1911", "Отечественная война и русское общество (1812—1912). Юбилейное издание. Т. 1—7. М., 1911—1912". Усе кнігі маюць багатае аздабленне, шыкоўныя пераплёты, шматлікія ілюстрацыі славутых мастакоў — І.Я. Рэпіна, М.М. Ге, А.Д. Кіўшанкі і г.д. Дарэчы, цікава адзначыць той факт, што ў ліку рэдактараў абодвух выданняў сустракаецца імя навукоўца У.І. Пічэты, які пазней стаў першым рэктарам БДУ.

Фундаментальная бібліятэка БДУ запрашае ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй выдавецкай справы і ўвогуле гісторыяй, наведаць выставу. Аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі знаходзіцца на 2-м паверсе галоўнага корпуса БДУ ў пакоі 229. Час працы: з панядзелка па чацвер — 13.00—17.00, у пятніцу — 13.00—17.00.

*А.У. КІНЧЫКАВА,*
*бібліёграф 1-й катэгорыі*

# БІБЛІЯТЭКА БДУ ЗАПРАШАЕ

*12 сакавіка* на абанеменце хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) адкрылася кніжная выстава "Хімія цвёрдага цела".

*13 сакавіка* ў навуковай чытальнай зале (пр-т Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2-і паверх) адкрылася персанальная выстава навуковых прац прафесара, доктара фізіка-матэматычных навук А.В. Мінкевіча, прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння.

*15 сакавіка* ў чытальнай зале бібліятэкі юрыдычнага факультэта (вул. Маскоўская, 17) адкрываецца кніжная выстава "Арганізаваная злачыннасць".

*16 сакавіка* ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) адбудзецца кніжная выстава "У. Ігнатоўскі і яго час", прымеркаваная да 120-годдзя з дня нараджэння навукоўца.

*19 сакавіка* студэнцкая чытальная зала № 4 (пр-т Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 3-і паверх) запрашае на кніжную выставу "Геаграфія — навука аб Зямлі".

*23 сакавіка* ў чытальнай зале бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) адбудзецца кніжная выстава "Public relations".

*26 сакавіка* ў чытальнай зале хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) адкрыецца кніжная выстава, прымеркаваная да 130-годдзя з дня нараджэння А.Я. Чычыбабіна, рускага хіміка-арганіка.

*26 сакавіка* ў аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі (пр-т Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2-і паверх) будзе экспанавацца кніжная выстава "Ёсць вера наша горда гаварыць: мы — беларусы", прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння гісторыка, археолага А.П. Сапунова.

*27 сакавіка* на абанеменце бібліятэкі філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31) адкрыецца кніжная выстава да 130-годдзя з дня нараджэння Г. Мана "Мара пра сапраўдных герояў".

*30 сакавіка* ў чытальнай зале хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14) адкрыецца кніжная выстава, прымеркаваная да 60-годдзя з дня нараджэння А.І. Лесніковіча, акадэміка НАНБ, прафесара, загадчыка кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі.

Апрача таго, *на працягу ўсяго месяца* працуе шэраг іншых выставаў, арганізаваных Фундаментальнай бібліятэкай БДУ:

— з кніжнай выставай "Сучасныя праблемы вышэйшай школы" можна пазнаёміцца ў навуковай чытальнай зале (пр-т Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2-і паверх);

— кніжная выстава "International law" у чытальнай зале факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25) дэманструе замежную літаратуру па праве;

— у чытальнай зале бібліятэкі радыёфізічнага і біялагічнага факультэтаў (вул. Курчатава, 5) праходзяць выставы "У дапамогу дыпломніку-практыканту" і "Excel і Word для Windows".

*Аддзел бібліятэчнай рэкламы*
*Фундаментальнай бібліятэкі*
*Белдзяржуніверсітэта*

# МЕНЕДЖМЕНТ СУЧАСНАЙ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

З 19 лютага па 2 сакавіка 2001 года ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы БДУ прайшлі курсы пад назвай "Менеджмент сучаснай вышэйшай школы" для куратараў навучальных груп ВНУ.

Слухачы курсаў азнаёміліся з асноўнымі накірункамі сацыяльна-выхаваўчай працы ў вышэйшай школе, абмеркавалі бягучыя пытанні арганізацыі працы куратараў са студэнтамі. Напрыканцы заняткаў былі падведзеныя вынікі, адбыўся абмен думкамі за круглым сталом.

*А.А. ЛАБКОЎ,*
*метадыст упраўлення*
*выхаваўчай работы з моладдзю*



*Прафесар РІВШ БДУ Л.І. Шумская (у цэнтры) падчас абмеркавання пытанняў па арганізацыі працы куратараў.*



# "Мы займаемся сваёй улюбёнай справай..."

*Напярэдадні сапраўднай вясны танцавальны калектыў Non Stop запрасіў усіх жадаючых на сваё свята – групе споўнілася тры гады.*

*У праграме шоу былі не толькі выступы групы, але і віншаванні ад дырэкцыі студгарадка і дырэкцыі па справах культуры БДУ, а таксама нумары студэнтаў з інтэрнатаў № 7 і № 10. Што датычыць выступу самой групы, то трэба адзначыць, што яна вельмі ўзрадавала публіку (асабіста мне запомніўся іх фінальны выхад – мюзікл "Гісторыя аднаго кахання"). Скончыўся вечар дыскатэкай, апошняй мелодыяй якога стала "Калыханка".*

*Каб паболей даведацца пра Non Stop, я пазнаёмілася з хлопцамі з групы – Віктарам і Андрэем. Абодва яны – студэнты хімічнага факультэта, толькі Віктар Гулько навучаецца на 3-м курсе, а Андрэй Хацяновіч –на 5-м.*



*— Калі і як стварылася ваша група? Каму належыць ідэя стварэння такога калектыву?*

**Віктар:** Увесну 1998 года нашаму шэфу і арганізатару Ірыне Чахаўскай, тады яшчэ студэнтцы фізічнага факультэта, прыйшла на розум гэтая ідэя. Іра танчыла ўжо з шасці гадоў, скончыла харэаграфічную школу і вырашыла арганізаваць нешта кшталту танцавальнай групы. І ёй гэта ўдалося.

*— Як асабіста вы трапілі ў калектыў?*

**Віктар:** Калі навучаўся яшчэ на першым курсе, на святе "Віват, першакурснік!" я выступаў з нейкім нумарам. А пасля выступлення да мяне падыйшла Ірына і прапанавала заняцца танцамі больш сур'ёзна. Я пагадзіўся.

**Андрэй:** Я яшчэ са школы займаўся бальнымі танцамі. Гэта ў мяне, можна сказаць, у крыві: мой бацька — музыкант, відаць, любоў да музыкі прыйшла да мяне ад яго. У 1998 годзе я ўбачыў аб'яву, паводле якой усе жадаючыя маглі паспрабаваць сябе ў танцах. Я прыйшоў — мне спадабалася.

*— Як вы пачуваецеся на сцэне?*

**Віктар:** Хвалюемся. У першы выступ гэта асабліва адчувалася. З часам, праўда, прызвычайваешся.

**Андрэй:** Ёсць танцы, якія выконваюцца непасрэдна тварам да гледача. Гэта больш напружана. Быў выпадак, калі на вечары народ расступіўся, і мы павінны былі танчыць не на сцэне, а ў коле, якое ўтварылася. Было крыху... няёмка. Адчуваеш людзей занадта блізка ад сябе — літаральна за метр. Гэта неяк скоўвае.

**Віктар:** Часам мы не бачым залу з-за пражэктараў. Тады мы адчуваем сваю ізаляванасць, якая здымае ўсялякую сарамяжлівасць. І гэта, можа быць, пакуль што лепей...

*— На дыскатэках вы, мабыць, вылучаецеся з агульнай масы?*

**Андрэй:** Мы проста не думаем пра гэта.

*— А як складваюцца адносіны ўнутры калектыву?*

**Віктар:** Выдатна. Мы вельмі сябруем. Імкнемся сустракацца як мага часцей, адзначаем разам усе дні нараджэння, святы.

*— Распавядзіце крыху пра склад вашай групы.*

**Віктар:** Група складаецца прыблізна з 12 пастаянных удзельнікаў, але асноўны касцяк — 6 чалавек, якія ўвесь час выступаюць у калектыве з часу яго заснавання.

*— Ці шмат жадаючых трапіць у Non Stop?*

**Андрэй:** Жадаючых хапае. Але збольшага на рэпетыцыю прыходзяць адзін раз, а потым адсейваюцца.

**Віктар:** Іра задае такі тэмп, што не кожны вытрымае.

*— Чым вы яшчэ цікавіцеся, апрача танцаў?*

**Віктар:** Люблю футбол. І футбол, і танцы дапамагаюць трымаць сябе ў добрай фізічнай форме.

**Андрэй:** Маё хобі — радыётэхніка: нешта ўвесь час паяю.

*— З часам праблемаў няма?*

**Андрэй:** Ёсць, вядома, асабліва калі ўлічыць, што ў нас позна сканчаецца навучанне. Але ж мы займаемся сваёй улюбёнай справай... Мне асабіста група дала магчымасць выявіць сябе.

*— Якія праблемы, звязаныя з Non Stop, хвалююць вас сёння?*

**Андрэй:** Гэтага хапае. Напрыклад, за 2 тыдні да нашага апошняга канцэрта збіраліся закрыць нашую залу для трэніровак. Уявіце толькі! Дзякуй Іры — яна ўсё ўладзіла, але ці надоўга?

*— А з касцюмамі як?*

**Віктар:** Калі ўсё толькі пачыналася, у нас не было аніводнага касцюма. Выступалі ва ўсім сваім. Але дырэкцыя студгарадка дапамагла ў гэтым пытанні.

*— Хто стварае вам вобразы на сцэне, нараджае танцы?*

**Віктар:** Іра — усё робіць і прыдумвае яна. Канечне, на рэпетыцыях нешта карэктуецца, але пераважна танцы — яе заслуга.

*Напрыканцы я хачу ад сябе асабіста павіншаваць увесь калектыў Non Stop і пазычыць ім поспехаў і высокага ўзроўню прафесіяналізму. Болей жыцця, болей іскры ў танцах!*

*Наталля ДРОБЫШ,*
*студэнтка III курса*
*факультэта журналістыкі*
*Фотаздымак Наталлі ЖЛОБА*

# РАМАНТЫКА ГІСТАРЫЧНЫХ РУІНАЎ І... ШКОЛЬНАЙ СПАРТЗАЛЫ

Вам даводзілася калі-небудзь ездзіць у аўтобусныя экскурсіі? Калі не, дык вы шмат згубілі — не адчулі сапраўднай рамантыкі падарожжаў па роднай зямлі. Так-так, менавіта па Радзіме, таму што шматдзённае аўтобуснае падарожжа ў Чэхію ці Германію могуць дазволіць сабе толькі больш-менш заможныя маладыя



*Замак у Гальшанах.*

людзі. Што ж датычыць мяне, то я ўжо маю вялікі вопыт наведвання маляўнічых і гістарычных куточкаў Беларусі менавіта ў час аўтобусных паездак, арганізаваных буйнымі турыстычнымі арганізацыямі. "Клюнуўшы" раз на аб'яву-запрашэнне, вы станеце доўгачасовым кліентам: вас запрашаюць яшчэ і яшчэ...

У мінулым у мяне засталіся паездкі ў Гродна і Полацк, Навагрудак і Жыровічы. І вось, пачуўшы неўзабаве пасля навагодніх святаў знаёмы голас у тэлефоннай трубцы, зноў пачаў хвалявацца. Канешне, цікаўнасць да падарожжаў і на гэты раз не дазволіла мне адмовіцца. Дый маршрут надта прывабны: Крэва—Баруны—Гальшаны. Зараз гэта проста невялікія вёскі на карце Гродзенскай вобласці — наўрад ці ўдасца дабрацца туды без асаблівай нагоды. Праўда, умовы паездкі абяцаюць быць досыць спартанскімі, але мне, вопытнаму ўжо чалавеку, гэта не страшна.

Прайшло амаль два тыдні. Зборы і запрашэнні сяброў і знаёмых раздзяліць са мной радасць падарожжа засталіся ў мінулым. Седзячы ў старым аўтобусе нямецкай вытворчасці, аглядаеш занесеныя снегам палі і лугі, з нейкім асаблівым задавальненнем глядзіш на ДАІшнікаў у цёплых паліто і вясковых жыхароў у кажухах, што з неахвотай выйшлі з дому ў марозны суботні дзень. Вакол — каля 30 чалавек: пераважна студэнты, добрая палова якіх вядомая яшчэ па мінулагодніх экскурсіях.

Знаёмства з Крэвам не прынесла нічога нечаканага — руіны замка, дзе ў 1385 годзе была заключаная Крэўская унія, з традыцыйным надпісам "Ахоўваецца дзяржавай". Да аднаўлення гістарычнага будынка па аналогіі са знакамітым на ўвесь свет Мірскім замкам рукі ў дзяржавы і прыватных інвестараў пакуль не даходзілі. Праўда, сучаснымі архітэктарамі распрацаваны праект рэканструкцыі Крэўскага касцёла.

Іншая справа — Баруны. Тутэйшая славутасць — старажытны касцёл — заўсёды выкарыстоўвался "па прызначэнні". Пераменлівасць і мітуслівасць зямнога жыцця у гэтым храме адчуваеш дастаткова выразна, нават калі не вызнаеш сябе католікам.

А пасля аўтобус рухаецца на паўночны захад, пераязджаючы мяжу Смаргонскага і Ашмянскага раёнаў. І вось, нарэшце, Гальшаны — "месца маёй мары". Напэўна не знойдзецца ў Беларусі чалавека, які не чытаў ці хаця б не чуў пра раман Уладзіміра Караткевіча "Чорны замак Альшанскі". Па галерэях гэтага замка блукаюць "дама з чорным манахам" — цені закаханых Грэміслава Валюжыніча і Ганны-Гардзіславы Гальшанскай, замураваных у сцяне помслівым магнатам. Таямнічыя зашыфраваныя надпісы ўказваюць на схаваныя ў зямлі скарбы...

"Чорны замак", канешне, не чорны, а хутчэй цёмна-чырвоны — натуральны колер старых цагляных пабудоваў. І ўсё ж, зацененыя дрэвамі старога парка, з паваленымі перакрыццямі, праз якія можна ўбачыць змрочныя падзямеллі, ён здаецца ў цёмны час сутак менавіта чорным. Нашай групе давялося быць каля руінаў замка падчас сустрэчы старога Новага года. Цырымонія тая добра запомнілася: скокі ў імправізаваным святочным карагодзе і пацалунак з прыгожай дзяўчынай, якую ведаеш яшчэ па мінулых паездках, не маглі не пакінуць прыемнага ўражання.

Вяртаючыся да гісторыі Гальшанаў, трэба адзначыць яе сапраўднае багацце на разнастайныя падзеі. Павел-Стэфан Сапега, які валодаў Гальшанамі ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзяў, пакінуў яркі след у жыцці мястэчка: пры ім быў пабудаваны замак, арганізаваная паперня — фабрыка па вытворчасці высокаякаснай паперы з філігранню, на якой змяшчаўся герб Сапегаў "Ліс". Гэты ж магнат запрасіў у Гальшаны каталіцкі ордэн францысканцаў і пабудаваў для іх касцёл і кляштар.

Аднак гальшанскія валоданні Сапегаў аказаліся недаўгавечнымі. Адна з дачок Паўла-Стэфана памерла маладой, дзве другія сталі манахінямі. Маёнтак перайшоў да яго пляменнікаў, якія і падзялілі спадчыну.

Шмат вады ўцякло з таго часу. Знікла з карты свету Рэч Паспалітая. У 1812 годзе праз мястэчка адступала з Масквы пераможанае войска Напалеона. На гальшанскім рынкавым пляцы было павешана некалькі паўстанцаў 1863 года. Побач з Гальшанамі прайшла лінія фронту Першай сусветнай вайны. Кайзераўскіх салдатаў змянілі "чырвоныя". Адышлі камісары — з'явіліся польскія акупанты-легіянеры. У 1939 годзе сюды прыйшлі часткі Чырвонай арміі. Потым была нямецкая акупацыя і вызваленне ў 1944 годзе.



*Філіял Нацыянальнага мастацкага музея — былы францысканскі кляштар.*

Зараз Гальшаны — вёска. Авеяная легендамі шматвяковая гісторыя, руіны радавога замка, цені вялікіх князёў, каралёў, герояў, што лунаюць над старажытнымі сценамі, — усё гэта стварае ў Гальшанах атмасферу трохі змрочнай і адначасна прыцягальнай рыцарскай даўніны.

І не здаецца дзіўным, што ў гэтай незвычайнай вёсцы працуюць два музеі. У былым францысканскім кляштары размяшчаецца філіял Нацыянальнага мастацкага музея: тут можна ўбачыць творы беларускіх і замежных мастакоў, графікаў, скульптараў. А ў Гальшанскай сярэдняй школе звыш 20 гадоў дзейнічае гісторыка-краязнаўчы музей, які ўзначальвае яго стваральнік, былы дырэктар школы, а цяпер проста выкладчык гісторыі Эдуард Сямёнавіч Корзун. У музеі няма муляжоў, усе экспанаты: старажытная зброя і манеты, кераміка і пячаткі — самыя што ні ёсць сапраўдныя, як і ўсё ў гэтых мясцінах.

Праўда, сервіс для турыстаў тут не на самым высокім узроўні. З установаў грамадскага харчавання тут ёсць толькі сталовая (у якой у пасляабедзенны час ужо няма гарачых страваў) ды досыць няўтульны піўны бар. А пра якую-небудзь гасцініцу няма і гаворкі. Таму нашай групе давялося начаваць на матах у спартыўнай зале мясцовай школы. Але асабіста я пра гэта не шкадую — гэта па-свойму здорава: разлегчыся на такім знаёмым са школы маце ў паліто, амаль па-сямейнаму абняўшыся з абаяльнай дзяўчынай у футры. А перад сном удалося нават натанцавацца на дыскатэцы ў сельскім клубе. Але, на жаль, у такім слаўным месцы беларускай гісторыі не прагучала ніводнай беларускай кампазіцыі...

Пасля рамантычна праведзеных дня і ночы падымацца давялося ў 5 гадзін раніцы. Хутка збіраем рэчы, ідзем да аўтобуса. І вось мы ў дарозе, за акном мільгаюць знаёмыя і незнаёмыя палі і пералескі. Большая частка людзей у аўтобусе дрэмле, але мне чамусьці не спіцца... Усё ж такі добра, што я сюды з'ездзіў, не дарэмна аддаў грошы.

*Яўген ІВАНОЎ*

# Асцярожна. Кантрафакт...

*У Беларусі відэарынак больш чым на 90 працэнтаў нелегальны. Аўдыёрынак – крыху ў меншай ступені. А тут яшчэ кантрафактныя кампакт-дыскі, якія вязуць да нас з Расіі, Украіны і Кітая.*

*Той, хто прапануе нам кантрафакт, парушае правы не толькі аўтара, выканаўцы і вытворцы фанаграмы, але і нашыя з вамі правы на якасны тавар. "Левая" прадукцыя не вызначаецца якасцю. І гэта не павінна выклікаць сумненняў. Паколькі вытворца кантрафактнай прадукцыі можа канкурыраваць з ліцэнзійнай толькі па цане, ён імкнецца ўсялякім чынам зменшыць выдаткі на выпуск свайго тавару. А значыць, і тэхналогіі не вытрымліваюцца. Аляксандр Абрамчук, намеснік старшыні Камітэта па аўтарскіх і сумежных правах, падзяліўся з намі інфармацыяй, як адрозніць кантрафакт без асаблівых намаганняў, не звяртаючыся па дапамогу да спецыяліста.*

### *Пачнем з афармлення.*

Афармленню пірат вялікага значэння не надае. Укладышы да аудыёкасет і кампакт-дыскаў, каробак відэакасет маюць размыты, зярністы, з рэзкімі пераходамі паўтаноў малюнак. Тэкст, асабліва дробны, цяжка чытаецца, бо робіцца на звычайным прынтэры на паперы непаліграфічных гатункаў, з выкарыстаннем такога ж таннага чарніла. Ды і наогул, назвы песень і іншыя надпісы могуць быць пераблытаны. Укладышы часта маюць малюнак і тэкст толькі з аднаго боку, што не адпавядае нормам. Каробка з касетай не пакрыта тэрмічнай плёнкай, якая б засцерагала ад пылу і вільгаці.

Аднойчы ў Камітэт па аўтарскіх і сумежных правах прынеслі на экспертызу ажно 97 аўдыёкасет увогуле ў пацёртых, пыльных, патрэсканых і паламаных каробках. Зразумела, што тыя ўжо выкарыстоўваліся раней.

На аўдыёкасеце ліцэнзійнага вытворцы фанаграмы, калі яна выпушчана вялікім тыражом, вы не ўбачыце надпісаў з паведамленнем, хто менавіта выпусціў чыстую касету. На іх месца абавязкова наносяцца надпісы са сваёй назвай, абазначаюцца свае маёмасныя правы, тлумачыцца, у якім рэжыме запісана касета і г. д.

Аднак законны вытворца малога тыражу ўсё ж можа пакінуць на касеце, напрыклад, "SONY". У гэтым выпадку трэба быць уважлівым.

Калі вы бачыце надпіс "Выпушчана па ліцэнзіі Расійскага аўтарскага таварыства" або "РАО", то павінны ведаць, што апошняе не прадугледжвае распаўсюджванне гэтай прадукцыі на тэрыторыі нашай краіны.

### *А цяпер пра якасць.*

**Аўдыёкасеты.** Вытворцы кантрафактнага тавару часцяком выкарыстоўваюць для запісу няякасныя чыстыя касеты. Стужка ў іх можа аказацца занадта цвёрдай альбо рознай па таўшчыні. А дрэнная аснова будзе расцягвацца, асыпацца і г.д. Паколькі для запісу фанаграмы выкарыстоўваецца непрафесійная апаратура, дый сам запіс вядзецца на павышанай хуткасці, то пры гэтым не вытрымліваецца спектр сігнала і дынамічны дыяпазон, паказчыкі, якія характарызуюць якасць музыкі. Шумы ў паўзах паміж песнямі таксама гавораць пра нізкі ўзровень запісу і кантрафактнасць касеты.

Прафесіяналы такога сабе ніколі не дазволяць. У канкурэнтнай барацьбе якасць — першы паказчык.

**Кампакт-дыскі.** Кантрафактныя кампакт-дыскі гучаць няякасна, бо і яны часта вырабляюцца з таннага матэрыялу, з выкарыстаннем недасканалых матрыц, на зношаным абсталяванні. Таму вы можаце заўважыць іх нераўнамерную таўшчыню, адхіленні ад акружнасці, няроўную металізацыю (ірваныя краі, разводы і г.д.).

Ёсць кампакт-дыскі, якія пры цудоўнай якасці вырабу і афармлення ўсё адно могуць аказацца кантрафактнымі. Гэта датычыць вялікіх дыскаў, на якіх запіс зроблены ў так званым фармаце МР3, які змяншае аб'ём музычнага твору. Такім чынам, на адным кампакт-дыску можна запісаць каля 200 песень. Але гучанне пры гэтым можа аказацца вельмі нізкім па ўзроўні. Ліцэнзійныя дыскі стандартных памераў у такім фармаце не выпускаюцца.

Кантрафактныя кампакт-дыскі небяспечныя тым, што могуць несці ў сабе вірусы, якія, трапляючы на ваш камп'ютэр, здольныя знішчыць усю інфармацыю. І такія выпадкі ўжо вядомыя.

Кампакт-дыскі з праграмным забеспячэннем, што рэалізуюцца на рынку, практычна ўсе неліцэнзійныя. Яны звычайна прадаюцца без тлумачэння для карыстальніка. Першая прыкмета іх кантрафактнасці — наяўнасць праграм розных фірмаў, а таксама ўмоўна бясплатных праграм. Яны могуць утрымліваць і злачынную інфармацыю — накшталт "Генератара крэдытных картак", элементаў парнаграфіі і насілля, дапаможніка для пачынаючых тэрарыстаў па вырабе выбуховых прыстасаванняў і г.д.

**Відэакасеты.** Тое, што новы фільм з'явіўся на відэарынку ў той час, калі яшчэ працягваецца яго паказ у кінатэатрах, таксама падазрона. Напрыклад, з фільмам Мікіты Міхалкова "Сібірскі цырульнік" здарылася такая гісторыя. Ліцэнзійны відэафільм выйшаў у Новасібірску на дзвюх касетах напрыканцы сакавіка. А кантрафактны — прадаваўся ўжо ў лютым на адной касеце. Справа ў тым, што пірацкія копіі часам робяцца з тых відэакасет, што рассылаюцца фірмамі-вытворцамі дыстрыб'ютэрам і з'яўляюцца дэманстрацыйнай версіяй, з якой тыя могуць азнаёміцца і зрабіць заказ.

На ліцэнзійных відэакасетах, як правіла, ёсць толькі адзін фільм. На кантрафактных — два і больш. Яны выпускаюцца з паявілічаным часам запісу, з-за чаго пагаршаецца якасць паказу і гуку. Пры гэтым, як правіла, суправаджаюцца дрэнным дубляжом. Пераклад, бывае, адстае ад падзеяў на экране, што для ліцэнзійнага фільма проста недапушчальна. Калі ў цітрах вы прачыталі "Не для продажу і пракату" — вам сапраўды не пашанцавала.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*



# АЛКАГОЛЬ – ПАГРОЗА ДЛЯ ЕЎРАПЕЙСКАЙ МОЛАДЗІ

Смерць кожнага чацвёртага маладога чалавека ў Еўропе, а ў некаторых краінах Усходняй Еўропы — кожнага трэцяга чалавека ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў, наўпрост звязаная са спажываннем алкаголю, паведамляецца ў дакладзе Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ).

Толькі летась ад звязаных з алкаголем прычынаў у краінах Еўропы загінула 55 000 маладых людзей. Гэтая шакуючая лічба была агучаная ў Стакгольме на Еўрапейскай канферэнцыі на ўзроўні міністраў па праблеме моладзі і алкаголю, у якой прынялі ўдзел міністры аховы здароўя, палітыкі і маладыя людзі з 51 краіны Еўропы. Мэтай канферэнцыі стала выпрацоўка рэгіянальнай праграмы дзеянняў па прадухіленні небяспечнай тэндэнцыі, звязанай са спажываннем алкаголю сярод моладзі, і супрацьстаянню агрэсіўнай рэкламна-маркетынгавай палітыцы прадпрыемстваў прамысловасці, якія выпускаюць алкагольную прадукцыю.

"На працягу апошніх 10—15 гадоў мы з'яўляемся сведкамі таго, як моладзь становіцца асноўным прыярытэтам пры прасоўванні алкагольнай прадукцыі. У той час, калі велізарныя маркетынгавыя сродкі накіроўваюцца на аказанне ўплыву на паводзіны маладых людзей, стварэнне збалансаванага і здаровага стаўлення да алкаголю становіцца надзвычай цяжкім", — адзначыла Генеральны дырэктар СААЗ доктар Гро Гарлем Брундланд.

У сваім звароце да дэлегатаў канферэнцыі дырэктар Рэгіянальнага бюро СААЗ для Еўропы доктар Марк Данзон сказаў, што дамагчыся поспеху ў пытанні пра алкаголь было надзвычай цяжка. "Алкаголь глыбока ўкараніўся ў культуры і сацыяльнай дзейнасці многіх грамадстваў. Палітыка ў галіне здаровага ладу жыцця мусіць мець грамадскую падтрымку, заснаваную на разуменні яе важнасці", — сказаў ён. Для аказання гэтай падтрымкі Рэгіянальнага бюро СААЗ стварае новую еўрапейскую сістэму кантролю за алкаголем для збору інфармацыі пра спажыванне, шкоду, маркетынг і досвед розных краінаў у галіне абароны грамадскага здароўя.

*По матэрыялах Прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Ум. друк. арк. 1

Падпісана да друку ў 12.00

15 сакавіка
Зак. 88у
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Юрыя Жукава